# Дэкада гуманітарных дысцыплін 2021

Добрай традыцыяй стала штогадовае правядзенне ў нашай навучальнай установе дэкады гуманітарных дысцыплін. Гэтым разам яна прайшла ў снежні. Асноўныя мерапрыемствы былі прымеркаваны да значнай падзеі ў культурным жыцці краіны – 130-годдзя з дня нараджэння “песняра гармоніі і красы” Максіма Багдановіча. Вучні 8-х класаў далучыліся да творчасці вялікага земляка, прыняўшы ўдзел у пасяджэнні літаратурнай гасцёўні “Я хацеў бы спаткацца з Вамі...”; навучэнцы І курса каледжа сталі стваральнікамі творчага праекта “Вечна юны, як наша зямля...”. Выкананне песень і рамансаў на словы М. Багдановіча, дэкламацыя яго вершаў, рашэнне творчых задач дазволіла прысутным дакрануцца душой да чыстага свету багдановічскай паэзіі, адчуць, што ўсе мы разам “ляцім да зор”.







Завіталі да нас у госці і супрацоўнікі Нацыянальнага літаратурнага музея. Яны зладзілі квіс-гульню “Загадка Багдановіча” і правялі віктарыну “Кніганошы”. Вучні 5-х класаў і навучэнцы ІІ і ІІІ курсаў атрымалі магчымасць яшчэ раз прайсці жыццёвымі сцежкамі нашага знакамітага земляка, спасцігнуць таямніцу яго асобы. Як адзначылі супрацоўнікі музея, мерапрыемствы прайшлі ў творчай атмасферы, навучэнцы здолелі прадэманстраваць свае веды і рэалізаваць творчы патэнцыял. Гэта стала яшчэ адной сціплай краскай, уплеценай намі ў вянок памяці бессмяротнаму паэту.

Народная песня – наша духоўная спадчына, бясцэннае багацце. “Песню бярыце з сабою...”, “Песня – душа народа” – два мерапрыемствы, якія былі праведзены ў 6-х класах гімназіі і на ІІ курсе каледжа. Срэбныя гукі цымбалаў, чароўныя спевы “Рэчанькі”, “Купалінкі”, “Юрачкі” і інш. стварылі агульную атмасферу свята, дазволілі далучыцца да жыватворнай крыніцы народнай песні, зрабіўшы гэтыя праекты яркімі і запамінальнымі.



Прыемна здзівілі ўсіх навучэнцы ІІ днтх курса, якія сталі ініцыятарамі правядзення ясенінскага свята “Всю душу выплещу в стихи...” Яны, апантаныя сваёй ідэяй, аднесліся да падрыхтоўкі мерапрыемства творча, здолеўшы прадэманстраваць глыбокае разуменне ясенінскага паэтычнага слова і любоў да яго. Прысутныя былі літаральна захоплены натхнёным і выразным чытаннем вершаў, дасканалым выкананнем песень і рамансаў на словы Сяргея Ясеніна. Артыстызм, шчырасць, эмацыянальнасць выканаўцаў дазволілі гледачам апынуцца ва ўладзе яркай і глыбокай ясенінскай паэзіі, адчуць яе самабытнасць і непаўторнасць.





Як лічылі ў старажытнасці, “гісторыя – гэта настаўніца жыцця”. Вось чаму безумоўна карыснай для вучняў 5-х класаў стала віктарына “Пярэдняя Азія ў старажытнасці”. Дзеці з задавальненнем рашалі гістарычныя задачы, працавалі са “стужкай часу”, выконвалі групавыя творчыя заданні.





Для навучэнцаў каледжа была арганізавана інтэлектуальная гульня па гісторыі “Што? Дзе? Калі?”. Удзельнікі здолелі паказаць сваё ўменне працаваць у групе, прадэманстравалі не толькі веданне гісторыі, але і агульную эрудыцыю, знаходлівасць і дасціпнасць.

Несумненна, усе праведзеныя ў межах дэкады мерапрыемствы не толькі разнастаілі вольны час нашых навучэнцаў, але і вучылі творча падыходзіць да любой справы, арыентавацца ў незнаёмых абставінах, знаходзіць ва ўсім прыгажосць і гармонію. Такім чынам, зроблены яшчэ адзін важны крок на нялёгкім шляху фарміравання неардынарнай асобы, творчага чалавека. А наперадзе яшчэ шмат новага, карыснага і цікавага...